## ПРАНЯСІ ПРАЗ ПАКАЛЕННІ ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ І СУМЛЕННЕ *(Уладзімір Мазго)*



— Лянок, адкуль у цябе гэта пілотка?

— Гэта пілотка майго прадзеда. Ён ваяваў з фашыстамі, быў разведчыкам.

— А адкуль ты ведаеш? — пацікавілася Васілінка.

— Мне бабуля і тата расказвалі.

— А дай мне памераць пілотку, — папрасіла Васілінка.

— Глядзі, акуратна, — папярэдзіў Лянок. — Мне дазваляюць яе надзець толькі ў Дзень Перамогі 9 Мая. У памяць пра прадзеда. Мы яе вельмі беражом.

Спытайце ў сваіх бацькоў, бабулі ці дзядулі, хто з вашых родных і сваякоў удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне.

**Фрэнч** — прыталеная куртка ваеннага крою.

Паслухайце верш. Пра якое свята ў ім гаворыцца?

## Праўнук Перамогі

*Іван Муравейка*



Іду я з пра́дзедам сваім,
Іду на свята Перамогі.
Дзядуля ў фрэнчы франтавым,
Даўно пажу́хлым,
Ды зусім
Не пацямнелі ўзнагароды —

І ордэны, і медалі́
Блішчаць на сонейку, як зоры,
Нібыта іх яму далі́
Не шмат гадоў таму, а ўчора.



Яны расказваюць аб тым,
Як ваяваў савецкі воін,
Як праз агонь, ваду і дым
За родны край у бой ішоў ён.

Іду з дзядулем крок у крок
Да Вечнага агню святога.
Усе глядзяць на мой сцяжок:
Ён — праўнук Сцяга Перамогі.

1. Хто з'яўляецца дзейнымі асобамі верша?
2. Куды ідуць хлопчык з прадзедам?
3. Пра што расказваюць узнагароды на франтавым фрэнчы дзядулі? Прачытайце.
4. Як вы разумееце сэнс апошняга чатырохрадкоўя верша?
5. Якія думкі, пачуцці абудзіў у вас гэты твор? Навучыцеся чытаць верш выразна, урачыста.



Мінула ўжо больш за 70 гадоў з Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мы павінны заўсёды паважаць ветэранаў і памятаць пра тое, што яны вызвалілі нашу зямлю ад ворага.

А сустрэнеш дзядулю старога,
Пакланіся яму, гэта ён
Ваяваў, каб прыйшла Перамога
І быў мірны наш дзень і наш сон.

*Міхась Пазнякоў.*

На плошчы Перамогі ў Мінску ўстаноўлены велічны помнік воінам і партызанам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Каля абеліска гарыць Вечны агонь. У святочныя дні вучні нясуць каля яго ганаровую вахту.

Даведайцеся, якія помнікі героям Вялікай Айчыннай вайны ёсць у вашай мясцовасці. Раскажыце, як захоўваецца памяць пра воінаў і мірных жыхароў, што загінулі ў вайну.

